Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 11. Варыянт 2**

## Білет 11

**Практычнае заданне. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

**Заданне склала:** настаўнік гісторыі Дранец Я.А., УА «Полацкая дзяржаўная гімназія №1 ім. Ф. Скарыны»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Вызначыце кодавую назву ваеннай аперацыі па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Назавіце буйныя воінскія фарміраванні Савецкай Арміі, якія прынялі ўдзел у гэтай аперацыі.
2. Якую задачу павінна была рашыць «рэйкавая вайна» у ходзе Беларускай наступальнай аперацыі?
3. Назавіце вынікі дзейнасці партызан і дайце ім адзнаку.
4. Параўнайце два парады. Для чаго, на вашую думку, былі праведзены гэтыя парады?

**Крыніца I. Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён"**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца II. Па матэрыялах газеты "Беларусь Сегодня" ад 19 чэрвеня 2014 г.**

Трэці і заключны этап рэйкавай вайны стаў маштабнай падрыхтоўкай да аперацыі "Баграціён", партызанскія злучэнні ў гэты час грамілі варожыя гарнізоны па ўсёй тэрыторыі краіны. …У выніку шматлікіх выбухаў нямецкія пастаўкі для фронта скараціліся амаль напалову.

Напярэдадні пачатку трэцяга этапу партызанскім злучэнням нашай краіны быў накіраваны ліст ад сакратара ЦК КП(б)Б Панцеляймона Панамарэнкі: “Супернік, выкарыстоўваючы зацішша на савецка-германскім фронце, узмацніў перавозкі жывой сілы, тэхнікі па чыгунках. З мэтай зрыву варожых перавозак загадваю: Усімі сіламі злучэння правесці масавае разбурэнне рэек метадам рэйкавай вайны.

Падрыхтоўку аперацыі прыступіць неадкладна, захоўваючы яе ў строгай таямніцы.

Наносіць бесперапынныя ўдары, дамагаючыся поўнага зрыву перавозак суперніка. Дадатковыя ўказанні даваць не буду, дзейнічаць самастойна. Аб ходзе аперацыі даносіць неадкладна”.

Партызаны падарвалі 61 тысячу рэек, восем чыгуначных мастоў, 5700 метраў праваднай сувязі, пусцілі пад адхон больш за 150 варожых эшалонаў, знішчылі больш за 15 тысяч і ўзялі ў палон 27,5 тысячы нямецкіх салдат і афіцэраў.

**Крыніца*III.***

| | |
|---|---|
|  |  |
| Партызанскі парад 16 ліпеня 1944 г. у Мінску | "Парад ганьбы" ў Маскве 17 ліпеня 1944 г. |

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

**1.**Аперацыя «Баграціён». Войскі 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх франтоў, 1-га Прыбалтыйскага фронту.

2.Наносіць бесперапынныя ўдары, дамагаючыся поўнага зрыву варожых перавозак шляхам масавага разбурэння рэек метадам рэйкавай вайны.

3. Партызаны падарвалі 61 тысячу рэек, восем чыгуначных мастоў, 5700 метраў правадной сувязі, пусцілі пад адхон больш за 150 варожых эшалонаў, знішчылі больш за 15 тысяч і ўзялі ў палон 27,5 тысячы нямецкіх салдат і афіцэраў.

Бліскуча праведзеная аперацыя мела важнае аператыўна-стратэгічнае значэнне, па сваіх маштабах яна ўвайшла ў летапіс Вялікай Айчыннай вайны як абсалютна новая з'ява ў гісторыі войн і партызанскага руху. Ніколі і нідзе яшчэ не было такога цеснага ўзаемадзеяння партызан з войскам, якое адыграла вялікую ролю ў дасягненні поспехаў на франтах.

**4.**Малюнак 1- партызанскі парад у Мінску 16 ліпеня 1944 г.

Малюнак 2 - "парад ганьбы" ў Маскве 17 ліпеня 1944 г.

***Навучэнцы выказваюць уласную думку аб мэтах правядзення гэтых мерапрыемстваў.***.

*Партызанскі парад 16 ліпеня 1944 года ў Менску па праве ўвайшоў у гісторыю як найзырчэйшы сімвал перамогі савецкага народа над вонкавым ворагам. Парад з'явіўся годным завяршэннем гераічнай эпапеі партызанскага руху ў Беларусі.*.

*У якасці ўдзельнікаў «парада пераможаных» былі абраныя выключна нямецкія ваеннапалонныя, захопленыя ў ходзе аперацыі «Баграціён». за поўнае знішчэнне суперніка.*Следам за калонай палонных ехалі палівальныя машыны, якіх у Маскве не бачылі з пачатку вайны, і змывалі з асфальта сляды "парада пераможаных": з маскоўскіх маставых змывалі сляды "гнілага фашысцкага паскуддзя".